Установа адукацыі
«Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў»

Факультэт інфармацыйна-дакументных камунікацый
Кафедра інфармацыйна-аналітычнай дзейнасці

УЗГОДНЕНА
Загадчык кафедры
___________М.А. Яцэвіч
___ ____________2022 г.

УЗГОДНЕНА
Дэкан факультэта
________Ю.М. Галкоўская
___ ____________2022 г.

ВУЧЭБНА-МЕТАДЫЧНЫ КОМПЛЕКС
ПА ВУЧЭБНАЙ ДЫСЦЫПЛІНЕ

# ЭКАНОМІКА БІБЛІЯТЭЧНА-ІНФАРМАЦЫЙНАЙ ДЗЕЙНАСЦІ

для спецыяльнасці 1-23 01 11 Бібліятэчна-інфармацыйная дзейнасць (па напрамках), напрамку спецыяльнасці 1-23 01 11-02 Бібліятэчна-інфармацыйная дзейнасць (менеджмент)

Складальнікі:
В. М. Бігеза, канд. філалагічных навук, дацэнт
І. Л. Беланоўская, старшы выкладчык

Разгледжана і зацверджана
на пасяджэнні Савета універсітэта 15 сакавіка 2022 г.
пратакол № 9

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Складальнікі:
В. М. Бігеза, дацэнт кафедры інфармацыйна-аналітычнай дзейнасці, кандыдат філалагічных навук, дацэнт
І. Л. Беланоўская, старшы выкладчык кафедры інфармацыйна-аналітычнай дзейнасці

Рэцэнзенты:

Рэкамендаван да зацвярджэння:
кафедрай інфармацыйна-аналітычнай дзейнасці ўстановы адукацыі «Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў» (пратакол №        );
Саветам факультэта інфармацыйна-дакументных камунікацый установы адукацыі «Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў» (пратакол №            )

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

# ЗМЕСТ

1. ТЛУМАЧАЛЬНАЯ ЗАПІСКА ........ 4
2. ТЭАРЭТЫЧНЫ РАЗДЗЕЛ ........ 6
3. ПРАКТЫЧНЫ РАЗДЗЕЛ ........ 7
3.1. Матэрыялы да семінарскіх заняткаў ........ 7
3.2. Тэматыка і методыка выканання практычных работ ........ 8
3.3. Тэматыка і методыка выканання лабараторных работ ........ 11
4. РАЗДЗЕЛ КАНТРОЛЯ ВЕДАЎ ........ 16
4.1. Метадычныя рэкамендацыі па арганізацыі і выкананні самастойнай работы студэнтаў ........ 16
4.2. Змест і формы кантролю самастойнай работы студэнтаў ........ 16
4.3. Тэставыя пытанні для выбарчага кантролю ведаў ........ 18
4.4. Пытанні да экзамену ........ 20
5. ДАПАМОЖНЫ РАЗДЗЕЛ ........ 21
5.1.Вучэбная праграма ........ 21
5.2. Вучэбна-метадычная карта вучэбнай дысцыпліны ........ 29
5.3. Асноўная літаратура ........ 31
5.4. Дадатковая літаратура ........ 32

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

# 1. ТЛУМАЧАЛЬНАЯ ЗАПІСКА

Актуальнасць вывучэння вучэбнай дысцыпліны «Эканоміка бібліятэчна-інфармацыйнай дзейнасці» абумоўлена неабходнасцю засваення студэнтамі прафесійных ведаў, уменняў і навыкаў па эканамічнай дзейнасці, якую ажыццяўляюць бібліятэкі ўсіх тыпаў і відаў.

Мэта вучэбнай дысцыпліны «Эканоміка бібліятэчна-інфармацыйнай дзейнасці» – падрыхтоўка спецыялістаў вышэйшай кваліфікацыі ў галіне арганізацыі эканомікі бібліятэчна-інфармацыйнай дзейнасці, садзейнічанне развіццю ў студэнтаў эканамічнага стылю прафесійнага мыслення.

Мэтавая накіраванасць вучэбнай дысцыпліны абумоўлівае вырашэнне наступных задач: навучанне спецыяльным ведам, уменням у галіне тэорыі і практыкі эканомікі бібліятэчна-інфармацыйнай дзейнасці і фінансавання бібліятэчных устаноў; вывучэнне канцэпцый, мадэляў, механізмаў і функцый бібліятэчнай эканомікі і фінансавання, асаблівасцей іх выкарыстання ў бібліятэчна-інфармацыйнай сферы; авалоданне метадамі гаспадарчай дзейнасці і вызначэння эканамічных нормаў і нарматываў бібліятэчнай работы.

Вучэбна-метадычны комлекс (далей – ВМК) з’яўляецa сістэмай дыдактычных сродкаў навучэння па вучэбнай дысцыпліне "Эканоміка бібліятэчна-інфармацыйнай дзейнасці". Ён з'яўляецца структурна-лагічнай мадэллю працэсу фарміравання прафесійна значных кампетэнцый бібліятэкара-бібліѐграфа, неабходных для разумення сутнасці, задач, функцый і асаблівасцяў эканамічнай дзейнасці бібліятэк.

Мэта ВМК па дысцыпліне " Эканоміка бібліятэчна-інфармацыйнай дзейнасці " – сістэматызацыя вучэбна-метадычных матэрыялаў, неабходных пры вывучэнні тэарэтычных і практычных пытанняў па эканамічнай дзейнаці, якую ажыццяўляюць бібліятэкі ўсіх тыпаў і відаў.

Задачы ВМК:

- сістэматызацыя зместу дысцыпліны "Эканоміка бібліятэчна-інфармацыйнай дзейнасці";
- упарадкаванне працэсу вывучэння вучэбнай дысцыпліны з улікам дасягненняў навукі і практыкі;
- забеспячэнне арганізацыі самастойнай вучэбнай работы і кантролю ведаў студэнтаў;
– аказанне метадычнай дапамогі студэнтам у засваенні навучальнага матэрыялу;
– аказанне метадычнай дапамогі выкладчыкам, неабходнай для якаснага выкладання дадзенай вучэбнай дысцыпліны.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Структура УМК адпавядае рэкамендацыям "Палажэння аб вучэбна-метадычным комплексе ва ўстанове адукацыі" Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў "(зацверджана загадам рэктара ўніверсітэта 26.04.2017, № 69) і ўключае ў сябе наступныя раздзелы:

Тэарэтычны радзел. Па вучэбнай дысцыпліне "Эканоміка бібліятэчна-інфармацыйнай дзейнасці" выдадзен падручнік, які забяспечвае атрыманне вышэйшай адукацыі, адпавядае тыпавой праграме дысцыпліны і забяспечвае матэрыяламі, неабходнымі для тэарэтычнага вывучэння і засваення вучэбнай дысцыпліны. У сувязі з тым, што ен размешчан ў рэпазіторыі ўніверсітэта як электронны адукацыйны рэсурс з забеспячэннем да яго вольнага доступу, у раздзеле даеца спасылка на яго адрас для выкарыстання ў вучэбных мэтах.

Практычны раздзел – змяшчае працоўныя матэрыялы, заданні да практычных заняткаў, метадычныя рэкамендацыі да іх выканання ў аб'ёме, вызначаным вучэбнай праграмай, якія будуць спрыяць засваенню, фарміраванню ўменняў і навыкаў у галіне эканамічнай дзейнасці бібліятэк, замацаванню тэарэтычных ведаў і іх праверцы. У раздзел ўключаецца таксама тэматыка семінарскіх заняткаў, парадак іх правядзення, індывідуальныя заданні для падрыхтоўкі, рэкамендуемая літаратура для падрыхтоўкі да заняткаў і замацавання пройдзенага матэрыялу.

Раздзел кантролю ведаў уключае заданні для самастойнай і кантралюемай самастойнай работы, пералік кантрольных пытанняў да заліку, прыкладную тэматыку рэфератаў, крытэрыі ацэнкі вынікаў вучэбнай дзейнасці студэнтаў.

Дапаможны раздзел уключае вучэбную праграму па вучэбнай дысцыпліне, вучэбна-метадычную карту вучэбнай дысцыпліны для дзѐннай і завочнай формаў атрымання адукацыі, спісы асноўнай і дадатковай літаратуры.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

## 2. ТЭАРЭТЫЧНЫ РАЗДЗЕЛ

Для вывучэння і засваення матэрыялу па вучэбнай дысцыпліне «Эканоміка бібліятэчна-інфармацыйнай дзейнасці» рэкамендуецца выкарыстоўваць вучэбны дапаможнік, які размешчан ў рэпазіторыі установы адукацыі “Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў”.

Пераверзева, Ю. А. Фінансава-эканамічная дзейнасць бібліятэк: вучэбна-метадычны дапаможнік / Ю. А. Пераверзева ; [сярод рэц. Н. А. Ляйко, С. А. Паўлава]. – Мінск : [б. в.], 2009. – 112, [1] с. ; Тое ж [Электроны рэсурс]. – Рэжым доступа : http://hdl.handle.net/123456789/4710 . – Дата доступа : 01.11.2021.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

# 3. ПРАКТЫЧНЫ РАЗДЗЕЛ

## 3.1 Матэрыялы да семінарскіх заняткаў

### **Семінар 1.** *Тэма. Бібліятэчная мікраэканоміка*

1. Вызначэнне паняцця “бібліятэчная мікраэканоміка”. Задачы эканомікі бібліятэкі. Накірункі мікраэканамічных даследаванняў у бібліятэках.
2. Накірункі дзейнасці сучаснай бібліятэкі, як гаспадарчага суб’екта.
3. Кампаненты бібліятэчнай мікраэканомікі.
4. Мадэлі мікраэканамічнай дзейнасці бібліятэк. Этапы распрацоўкі мадэлей.

### Бібліяграфічны спіс літаратуры:

Басамыгина, И.Н. Микроэкономика библиотечного дела: науч.- практ. пособие / И.Н.Басамыгина.– М.: Либерея – Бибинформ, 2006.– 160с.

Клюев, В. К. Библиотечная микроэкономика (методология, менеджмент, маркетинг, дидактика) / В. К. Клюев // Библиотековедение.– 2000.– № 1.– С. 28–35.

Клюев, В. К. Хозяйственная практика библиотеки: комплексный подход / В. К. Клюев // Библиография.– 2003.– № 2.– С.17–23.

Пераверзева, Ю. А. Фінансава-эканамічная дзейнасць бібліятэк: вучэбна-метадычны дапаможнік / Ю. А. Пераверзева ; [сярод рэц. Н. А. Ляйко, С. А. Паўлава]. – Мінск : [б. в.], 2009. – 112, [1] с. ; Тое ж [Электроны рэсурс]. – Рэжым доступа : http://hdl.handle.net/123456789/4710 . – Дата доступа : 01.11.2021.

### **Семінар 2.** *Тэма. Сацыяльна-эканамічныя нормы і нарматывы ў бібліятэчнай справе*

1. Бібліятэка, як сацыяльна-эканамічная сістэма.
2. Паняцце і віды нормаў, выкарыстоўваемых у бібліятэчнай дзейнасці.
3. Эканаметрычныя мадэлі, як сродак пабудовы нарматываў у бібліятэчнай справе.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

## Бібліяграфічны спіс літаратуры:

Галковская, Ю. Н. Правовое обеспечение деятельности библиотек в Республике Беларусь: науч.-практ. пособие / Ю. Н. Галковская. – Минск : Новое знание, 2008. –134 с. – (Сер. «Профессионалам библиотечного дела»).

Дригайло, В. Г. Основы управления библиотекой высшего учебного заведения: науч.-практ. пособие. – 2-е изд., перераб. и доп. / В. Г. Дригайло, Е. В. Башун, В. Н. Волынец. – М.: Либерея, 2004.– С.29–31.

Дригайло, В. Г. Основы научной организации труда в библиотеках: науч.-метод. пособие / В. Г.Дригайло.– Москва: Либерея, 2005.– С. 24–31.

Смирнова, Н. А. Трудовые нормы времени в библиотечных процессах / Н.А.Смирнова // Библиотековедение.– 2002.– № 6.– С.40–44.

Фенелонов, Е. А. Социально-экономические нормы в библиотечном деле / Е. А. Фенелонов // Библиотечное дело XXI век: науч.-практ. сб.– 2004.– № 1 (7).– С.45–51.

## 3.2.Тэматыка і методыка выканання практычных работ

### Практычная работа 1.

*Тэма: “Стварэнне тэрміналагічнага слоўніка”*

*Мэта:* засваенне асноўных паняццяў па дысцыпліне.

*Заданне:* даць азначэнне паняццям з указаннем крыніц пошуку звестак аб іх:

- арганізацыйныя дакументы
- баланс
- бюджэт
- бухгалтарскі баланс
- бюджэтнае фінансаванне
- выдаткі
- гадавая справаздача
- заработная плата
- індэкс заработнай платы
- інструкцыя

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

- кошт асноўных фондаў бібліятэкі
- матэрыяльнае стымуляванне
- наменклатура
- норма
- пасадавая інструкцыя
- пасадавы аклад
- плацѐжная ведамасць
- повремѐнная оплата труда
- палажэнне
- пазабюджэтныя сродкі
- рэжым працы і адпачынку
- сабекошт
- текучесть кадров
- фінансавая сістэма
- эканамічны аналіз бібліятэчнай дзейнасці
- эканоміка бібліятэчнай дзейнасці
- эканамічная мадэль

**Практычная работа 2.** *Тэма: "Выкарыстанне гаспадарчага разліку ў дзейнасці бібліятэк"*

*Мэта*: вывучыць сутнасць і мадэлі гаспадарчага разліку і іх выкарыстанне ў дзейнасці бібліятэк.

*Заданне*: прааналізаваць тэарэтычны матэрыял і вызначыць магчымасці выкарыстання прыбытку ад вядзення гаспадарчай дзейнасці ў бібліятэках.

*Методыка выканання:*

1. Паўтарыць тэарэтычны матэрыял па тэме "Гаспадарчая дзейнасць бібліятэчных устаноў".
2. Адказаць на наступныя пытанні:

- Дайце вызначэння паняцця "гаспадарчы разлік". У чым яго сутнасць?
- Пералічыце ўзроўні рэнтабельнасці
- Апішыце мадэлі гаспадарчага разліку
- Назавіце прыкметы прадпрыемства, працуючага па гаспадарчым разліку
- Якія паказчыкі, ліміты і эканамічныя нарматывы улічваюцца пры планаванні дзейнасці бібліятэк?
- З якіх раздзелаў складаецца гадавы план работы бібліятэкі?
- Якія кампаненты ўключаюцца ў фонд матэрыяльнага заахвочвання?
- У якіх выпадках устанаўліваюцца надбаўкі супрацоўнікам бібліятэк?

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

- Што маецца на ўвазе пад паняццем “сродкі фонду спажывання”? Якія сродкі ѐн утрымлівае?
- Самастойнымі ці не з’яўляюцца фонды вытворчага і сацыяльнага развіцця?
- Дайце вызначэнне паняцця “внутрипроизводственный хозрасчѐт”. У чым яго сутнасць?

3. Вынікі працы афармляюцца ў сшытках і абмяркоўваюцца ў малых групах.

**Практычная работа 3.** *Тэма: “Фарміраванне адзінага фонду фінансавых сродкаў біліятэкі”*

*Мэта*: замацаванне тэарэтычных ведаў і фарміраване практычных навыкаў у галіне акумулявання і размеркавання грашовых сродкаў бібліятэкі.

*Заданне:* вызначыць асноўныя накірункі фарміравання адзінага фонду фінансавых сродкаў бібліятэкі, іх размеркаванне і выкарыстанне.

*Методыка выканання работы:*

1. Паўтарыце тэарэтычны матэрыял па тэме і запоўніце наступную табліцу:

| № | Складаючыя кампаненты адзінага фонду фінансавых сродкаў | Крыніцы паступлення грашовых сродкаў | Расходванне грашовых сродкаў |
|---|---|---|---|
| 1. | | | |

2. Аформіце макеты дакументаў, на якіх заснавана стварэнне і выкарыстанне фонду заработнай платы і фонду матэрыяльнага заахвочвання: працоўная дамова (*глядзі дадатак 8*), прадстаўленне аб заахвочванні (*гл. дадатак 9*), загад аб заахвочванні (*гл. дадатак 10*), штатны расклад (*гл. дадатак 7*), структура і штатная колькасць (*гл. дадатак 6*).
3. Вызначце тарыфныя разрады і каэфіцыенты пасад кіраўнікоў і спецыялістаў бібліятэк, ЦБС, НББ, РНТБ, Нацыянальнай кніжнай палаты Беларусі. (*гл. дадаткі 11, 12*)
4. Азнаѐмцеся з кваліфікацыйнымі характарыстыкамі спецыялістаў розных пасад. Вызначце іх тарыфныя разрады і каэфіцыенты.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

5. Аформіце макет табліцы суадносін груп бібліятэк па аплаце працы супрацоўнікаў:

| група | фактычна абслужаныя карыстальнікі, чал. | кнігавыдача |
|---|---|---|
| I | звыш 40.000 | звыш 1.000.000 |
| II | ад 10.000 да 40.000 | ад 600.000 да 1.000.000 |
| III | ад 5.000 да 10.000 | ад 300.000 да 600.000 |
| IV | ад 3.000 да 5.000 | ад 180.000 да 300.000 |

6. Зрабіце вынікі

---

- Фінансавыя аспекты дзейнасці бібліятэк рэгламентуюца Пастановамі Савета Міністраў РБ, Пастановамі Міністэрства фінансаў, Міністэрства адукацыі, Міністэрства культуры і іншых органаў дзяржаўнага і грамадскага кіравання, маючых сеткі бібліятэк. Напрыклад: Об установлении размеров возмещения расходов при служебных командировках, О совершенствовании оплаты труда работников организаций, финансируемых из бюджета и пользующихся государственными дотациями, Об установлении расчѐтной нормы рабочего времени на … год і інш.

### 3.3. Тэматыка і методыка выканання лабараторных работ

**Лабараторная работа 1 .** *Тэма: “Разлік фонду працоўнага часу”*

*Мэта***:** замацаванне тэарэтычных ведаў і фарміраванне практычных навыкаў нарміравання бібліятэчных працэсаў.

*Заданне:*

1. Разлічыць ***гадавы фонд рабочага часу*** аддзела. Дзеля гэтага трэба запоўніць наступную табліцу:

| Прозвішча, імя, імя па бацьку супрацоўніка | выхадныя дні | святочныя дні | адпачынак | усяго | працоўныя дні |
|---|---|---|---|---|---|
| 1. | 104 | 8 | 20 | 132 | 233 |
| 2. | 104 | 8 | 72 | 184 | 181 |
| 3. | 104 | 8 | 20 | 132 | 233 |
| усяго | | | | | 647 |

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

***Гадавы фонд рабочага часу*** аддзела разлічваецца шляхам памнажэння працягласці працоўнага дня на колькасць працоўных дней ў годзе (*на ўсіх супрацоўнікаў аддзела*).

З улікам гадавога % на непрацаздольнасць (2%), які складае 106,1г. (*на усіх супрацоўнікаў аддзела*) гадавы фонд рабочага часу складаецца шляхам вылічэння ад агульнай колькасці гадавога фонду рабочага часу колькасці гадзін прапанаванай на непрацаздольнасць.

НАПРЫКЛАД:

***Гадавы фонд рабочага часу*** = 8г.12мін. х 647 = 5305,4г. (*на ўсіх супрацоўнікаў аддзела*)

***Гадавы % на непрацаздольнасць (2%)*** складае 106,1г. (*на ўсіх супрацоўнікаў аддзела*)

Такім чынам, ***гадавы фонд рабочага часу*** = 5305,4г. – 106,1г. = **5199,1г.** (*на ўсіх супрацоўнікаў аддзела*)

2. Разлічыць ***бюджэт рабочага часу аддзела*** (*на выбар студэнта*) ***на месяц*** з улікам норм на аперацыі, якія выконваюцца ў аддзеле. Для гэтага трэба скарыстацца “Тыпавымі нормамі часу на работы, якія выконваюцца ў бібліятэках”. Вынікі разліку афармляюцца ў выглядзе наступнай табліцы:

| № | назва працэса | адзінка вымярэння | норма выпрацоўкі | аб’ѐм работ | патрэбны аб’ѐм часу | выканаўца працэса |
|---|---|---|---|---|---|---|
| 1 | 2 | 3 | 4 | 5 | 6 | 7 |
| | | | | | | |

Для падліку трэба ўлічыць наступныя метадычныя парады:

а) пры вызначэнні рабочага часу аддзела трэба звярнуць увагу на колькасць працоўных дзѐн у месяцы (напрыклад, кастрычнік – 21 дзень) і колькасць супрацоўнікаў аддзела (напрыклад, 3 чалавекі). Таксама зрабіць падлік працоўных гадзін у месяцы па формуле: колькасць працоўных дзѐн у месяцы памножыць на працягласць працоўнага дня.

б) каб вызначыць аб’ѐм рабочага часу, патрэбны для выканання кожнага працэсу, трэба аб’ѐм работ памножыць на адпаведныя ім нормы часу.

в) каб вызначыць бюджэт працоўнага часу аддзела трэба падсумаваць вынікі, атрыманыя пры запаўненні п.6 табліцы.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

3. Разлічыць ***фонд працоўнага часу аднаго супрацоўніка*** аддзела па схеме:

| № | назва | колькасць |
|---|---|---|
| 1 | колькасць дзѐн у годзе | |
| 2 | колькасць выхадных дзѐн | |
| 3 | колькасць святочных дзѐн | |
| 4 | колькасць дзѐн адпачынку | |
| 5 | колькасць санітарных дзѐн | |
| 6 | агульная колькасць непрацоўных дзѐн | |
| 7 | колькасць працоўных дзѐн | |
| 8 | колькасць працоўных гадзін | |

*Заўвага*

а) колькасць працоўных дзѐн (фонд працоўнага часу аднаго супрацоўніка) вызначаецца зыходзячы з працягласці працоўнага дня (8г.12мін. ці 41г. у тыдзень) памножанага на колькасць працоўных дзѐн у годзе.

б) колькасць санітарных дзѐн уваходзіць у агульную колькасць працоўных дзѐн.

4. Абмеркаванне вынікаў працы.

**Лабараторная работа 2.** *Тэма: "Вылічэнне зводных коштавых паказчыкаў бібліятэчнай работы"*

*Мэта:* замацаванне тэарэтычных ведаў і практычных навыкаў разліку зводных коштавых паказчыкаў.

*Заданне:* разлічыць асноўныя зводныя паказчыкі бібліятэчнай работы.

*Метадычныя парады:*

Коштавая адзнака бібліятэчнага абслугоўвання дазваляе вылічыць суадносіны выдаткаў бібліятэкі з колькаснымі паказчыкамі яе дзейнасці, рацыяналізаваць выкарыстанне наяўных рэсурсаў, павысіць сацыяльна-эканамічную эфектыўнасць работы.

Пачатковымі крыніцамі для коштавага анілізу бібліятэчнай дзейнасці з'яўляюцца гадавыя каштарысы выдаткаў і справаздачы аб іх выкананні, а таксама асноўныя планавыя і справаздачныя колькасныя паказчыкі работы бібліятэкі. Улічваюцца ўсе каштарысныя выдаткі за выключэннем сродкаў на

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

набыццѐ абсталявання і інвентара (арт.12), на капітальны рамонт памяшканняў (арт. 16), якія з'яўляюцца не пастаяннымі, таму не адносяцца да бягучага зместу работы бібліятэкі.

*Методыка выканання работы:*

1.Паўтарыце тэарэтычны матэрыял па тэме і апішыце сістэму паказчыкаў ацэнкі эфектыўнасці бібліятэчнай работы.

2. Пералічыце паказчыкі ацэнкі эканамічнай эфектыўнасці бібліятэчнай работы.

3. Разлічыце кошт работы (паслугі) супрацоўніка бібліятэкі. Для разліку кошту гадзіны фонд заработнай платы супрацоўнікаў падзяліць на планавую колькасць працоўных гадзін персанала.

4. Разлічыце комплексныя фінансава-коштавыя паказчыкі: агульная сума выдаткаў бібліятэкі; размеркаванне выдаткаў па асобным накірункам (артыкулам); сярэдні выдатак на душу насельніцтва, што пражывае ў зоне абслугоўвання бібліятэкі; кошт абслугоўвання аднаго чытача; выдаткі на адно наведванне; выдаткі на здзяйсненне адной кнігавыдачы. Іх разлік робіцца шляхам дзялення агульнай сумы гадавога каштарысу (па ўсіх артыкулах) на агульную (гадавую) колькасць чытаоў, наведванняў, кнігавыдач і г.д.

5.Асобныя фінансава-коштавыя паказчыкі па канкрэтным бібліятэчным працэсам і аперацыям (відам работ) разлічваюцца зыходзячы з колькасці супрацоўнікаў, фонда іх заработнай платы, выдаткаў савакупнага рабочага часу. Затраты на адзінку выкананай работы вылічваюцца шляхам дзялення сумы зробленых на яе выдаткаў на агульную колькасць дадзенай работы.

**Лабараторная работа 3.** *Тэма: "Разлік кошту платных паслуг бібліятэк"*

*Мэта:* замацаванне тэарэтычных ведаў і фарміраванне практычных навыкаў распрацоўкі і ўкаранення ў практыку работы бібліятэк платных паслуг.

*Заданне:* распрацаваць мадэль платнай паслугі.

*Методыка выканання работы:*

Практычная работа праводзіцца ў форме дзелавой гульні. Кожны студэнт выступае ў якасці менеджэра/маркетолага, які распрацоўвае і прадстаўляе на разгляд членаў экспертнай рады паслугу для ўкаранення ў дзейнасць сваѐй бібліятэкі. Студэнты групы з'яўляюцца членамі экспертнай камісіі і прадстаўляюць інтарэсы супрацоўнікаў бібліятэкі і карыстальнікаў.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

На пасяджэнне экспертнай рады менеджэру/маркетолагу неабходна прадставіць бізнес-план паслугі, які складаецца з наступных пунктаў:

- назва паслугі
- тып бібліятэкі для якой распрацвана паслуга
- абгрунтаванасць аднясення паслугі да разраду платных
- адпаведнасць паслугі мэтам і задачам бібліятэкі
- вынікі вывучэння рынка, наяўнасць рэальнага ці патэнцыяльнага спросу, спосабы фарміравання спросу
- рэклама паслугі
- змест паслугі
- тэхналогія вытворчасці паслугі і неабходныя рэсурсы
- разлік сабекошту і цаны паслугі
- плануемая эфектыўнасць паслугі

Пры выкананні работы трэба карыстацца дадаткамі 2, 3, 4, 5.

Вынікі работы абмяркоўваюцца ў групе.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

# 4. РАЗДЗЕЛ КАНТРОЛЯ ВЕДАЎ

## 4.1. Метадычныя рэкамендацыі па арганізацыі і выкананні самастойнай работы студэнтаў

Арганізацыя самастойнай работы студэнтаў прадугледжвае работу з навуковай і вучэбна-метадычнай літаратурай, вывучэнне студэнтамі асобных пытанняў дысцыпліны, падрыхтоўку да семінарскіх заняткаў і экзамену.

Самастойная работа выконваецца ў любой рэкамендаванай форме па адной з тэм, якія прыведзены ніжэй. Яна павінна мець тытульны ліст, асноўную частку і спіс літаратуры.

Тэматыка самастойнай работы з'яўляецца абавязковай, але студэнт мае права звузіць ці пашырыць абраную тэму.

## 4.2. Змест і формы кантролю самастойнай работы студэнтаў

| № | тэма | змест задання | від кантролю |
|---|---|---|---|
| 1 | *Эканоміка іятэчнай справы як аўная частка юмікі культуры* | Стварэнне тэрміналагічнага слоўніка па курсу | Тэст-апытанне |
| 2 | *Эканамічная стора бібліятэкі* | Спрагназаваць развіццѐ рынку працы бібліятэчных супрацоўнікаў з улікам фактараў знешняга асяроддзя і асаблівасцей фарміравання ўнутранай прасторы | Праверка рэфератаў |
| 3 | *Бібліятэчная раэканоміка* | Вывучэнне мадэляў мікраэканамічнай дзейнасці бібліятэк. Аналіз магчымасці іх выкарыстання ў бібліятэчных установах Беларусі | Інфармацыйнае паведамленне на семінары |
| 4 | *Гаспадарчая йнасць бібліятэчных аноў* | Вывучэнне літаратуры па тэме. Аналіз паняційнага апарату. Азнаямленне з паказчыкамі эфектыўнасці гаспадарчай дзейнасці. Нарматыўнае | Апытанне на практычных занятках |

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

| | | | |
|---|---|---|---|
| | | забеспячэнне работы бібліятэк у сферы гаспадарчага разліку. | |
| 5 | *Сацыяльна- ...амічныя нормы і ...матывы ў ...іятэчнай справе* | Знаѐмства з відамі норм, выкарыстоўваемымі ў бібліятэчнай дзейнасці, адзінкамі вымярэння, метадамі вызначэння норм і нарматываў | Адказ на семінарскіх занятках |
| 6 | *Крытэрыі і ...азчыкі эфектыўнасці ...амічнай дзейнасці ...іятэк* | Азнаямленне з асноўнымі паказчыкамі; вывучэнне нарматыўнай дакументацыі. Падрыхтоўка рэфератаў па тэме. | Круглы стол |
| 7 | *Эканамічныя ...ады кіравання ...іятэкай* | Вывучэнне літаратуры і аналіз вопыта работы пэўных бібліятэк | Праверка матэрыялаў |
| 8 | *Крыніцы і ...нцыпы фінансавання ...іятэк* | Вывучэнне асноўных і дадатковых крыніц фінансавання бібліятэк з улікам асаблівасцей размеркавання фінансавых сродкаў; выяўленне прынцыпаў фінансавання. Вызначэнне залежнасці фінансавага забеспячэння і разліку фонду працоўнага часу. | Праверка канспекта СРС |
| 9 | *Адзіны фонд ...нсавых сродкаў ...іятэкі* | Вывучэнне тэарэтычнага матэрыялу па тэме | Апытанне на практычных занятках |
| 1 | *Фінансава- ...тавыя паказчыкі ...іятэчнай работы* | Вывучэнне тэарэтыка-метадычных матэрыялаў па тэме | Апытанне на практычных занятках |
| 1 | *Платныя паслугі ў ...эме фінансава- ...амічнай дзейнасці ...іятэк* | Аналіз літаратуры па тэме. Азнаямленне з нарматыўнымі дакументамі. Разлік кошту пэўнай платнай паслугі. Вывучэнне магчымасці выкарыстання спецыяльных картатэк і баз даных пры вызначэнні наменклатуры платных паслуг | Выкарыстанне падрыхтаваных матэрыялаў на практычных занятках |

## 4.3. Тэставыя пытанні для выбарчага кантролю ведаў

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

I. Асноўнай крыніцай фінансавання бібліятэк з'яўляюцца:

а) сродкі дзяржаўнага бюджэта

б) замежныя інвестыцыі

в) дабраахвотныя ахвяравання

II. Фінансаванне бібліятэк ажыццяўляецца ў адпаведнасці з:

а) заканадаўствам Рэспублікі Беларусь

б) пажаданнямі бібліятэк

в) магчымасцямі заснавальнікаў

III. Заснавальнікі бібліятэк у адпаведнасці з заканадаўствам гарантуюць:

а) фінансаванне бібліятэк

б) ліквідацыю бібліятэк

в) будаўніцтва бібліятэк

IV. Які з тэрытарыяльных узроўняў вылучаны ў Законе «О местном самоуправлении и местном хозяйстве в Республике Беларусь» і ўлічваецца пры фінансаванні бібліятэк:

а) міжнародны

б) рэспубліканскі

в) абласны

V. Сінонімам якога прынцыпа фінансавання бібліятэк з’яўляецца паняцце “недафінансаванне”:

а) астаткавага

б) нарматыўнага

в) сеткавага

VI. У аснове якога прынцыпа фінансавання знаходзіцца смета сярэднестатыстычнай бібліятэкі:

а) сеткавага

б) праграммна-мэтавага

в) астаткавага

VII. Пры якім прынцыпе фінансавання бібліятэк крытэрыем выдаткоўвання асігнаванняў зя’ўляецца расход грашовых сродкаў за бягучы год:

а) затратным

б) астаткавым

в) нарматыўным

VIII. Які з прынцыпаў фінансавання бібліятэк грунтуецца на аснове кантрольных лічбаў і стабільных доўгатэрміновых нарматываў:

а) нарматыўны

б) сеткавы

в) праграммна-мэтавы

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

IX. Дзе акумулююцца ўсе фінансавыя паступленні ў бібліятэку:

а) у адзіным фондзе фінансавых сродкаў

б) у фондзе матэрыяльнага заахвочвання

в) у фондзе заработнай платы

X. Якіх фінансавых планаў не існуе:

а) рэтраспектыўных

б) бягучых

в) перспектыўных

XI. Назавіце асноўныя віды расходаў бібліятэкі:

а) аперацыйныя

б) адміністрацыйна-гаспадарчыя

в) расходы на патрэбы кіраўніцтва бібліятэкі

XII. Да якога віду расходаў адносіцца выплата заработнай платы:

а) адміністрацыйна-гаспадарчым

б) операцыйным

в) матэрыяльным

XIII. Нормы, якія фіксуюць велічыню выдаткаў на адзінку работ па абслугоўванню карыстальнікаў могуць быць:

а) фінансавыя абавязковыя

б) фінансавыя факультатыўныя

в) матэрыяльныя

XIV. Факультатыўныя нормы распрацоўваюцца з улікам:

а) расходаў на камандзіроўкі і аплату лісткоў непрацаздольнасці

б) стаўкі заработнай платы

в) месцазнаходжання бібліятэкі

XV. Комплексная сістэма вывучэння попыту максімальна арыентаваная на задавальненне бібліятэчна-інфармацыйных запытаў – гэта:

а) бібліятэчны маркетынг

б) бібліятэчны менеджмент

в) бібліятэчная статыстыка

XVI. Прадметам эканомікі бібліятэчнай справы з’яўляюцца:

а) вытворчыя адносіны ў сферы бібліятэчнай дзейнасці

б) нефармальныя адносіны ў сферы бібліятэчнай дзейнасці

в) невытворчыя адносіны ў сферы бібліятэчнай дзейнасці

XVII. Эканамічныя рэсурсы бібліятэк могуць быць:

а) аднаўляльнымі

б) неаднаўляльнымі

в) вытворчымі

XVIII. Па зместу і прызначэнню эканамічныя рэсурсы бібліятэк могуць быць:

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

а) працоўнымі
б) матэрыяльна-тэхнічнымі
в) фінансавымі
г) інфармацыйнымі
д) арганізацыйнымі

XIX. Эканамічныя метады кіравання аказваюць уздзеянне на:
а) дзейнасць бібліятэкі
б) калектыў бібліятэкі і на асобных супрацоўнікаў
в) прыцягненне пазабюджэтнага фінансавання

## 4.4. Пытанні да экзамену

1. Эканоміка бібліятэчнай справы як састаўная частка эканомікі культуры.
2. Прынцыпы фінансавання бібліятэк.
3. Асноўныя крыніцы фінансавання бібліятэк.
4. Эканамічная прастора бібліятэкі.
5. Гаспадарча-дагаворная дзейнасць бібліятэк.
6. Крытэрыі эфектыўнасці эканамічнай дзейнасці бібліятэк.
7. Кампаненты бібліятэчнай мікраэканомікі.
8. Мадэлі мікраэканамічнай дзейнасці бібліятэк.
9. Планаванне фінансавай дзейнасці бібліятэк.
10. Крыніцы і прынцыпы фінансавання бібліятэк.
11. Дадатковыя крыніцы фінансавання бібліятэк.
12. Эканамічнаыя метады кіравання бібліятэкай і дзейнасцю супрацоўнікаў.
13. Ініцыятыўная эканамічная дзейнасць бібліятэк як састаўная частка сучаснай мадэлі гаспадарання ў бібліятэчна-інфармацыйнай сферы.
14. Класіфікацыя платных бібліятэчных паслуг.
15. Накірункі дзейнасці бібліятэкі як гаспадарчага суб'екта.
16. Арганізацыйна-метадычныя асаблівасці распрацоўкі наменклатуры платных паслуг.
17. Юрыдычная база фінансава-эканамічнай дзейнасці бібліятэк.
18. Вымярэнне эканамічнай эфектыўнасці ў бібліятэка: сутнасць і метады.
19. Гаспадарчы разлік у бібліятэчнай справе.
20. Асноўныя і платныя паслугі бібліятэк: суадносіны і асноўная характарыстыка.
21. Каштарыс бібліятэк.
22. Сутнасць і асноўныя рысы гаспадарчага механізму бібліятэк Беларусі.
23. Фінансавая дакументацыя бібліятэк.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

24. Асаблівасці размеркавання сродкаў фонда аплаты працы бібліятэчных супрацоўнікаў.
25. Методыка вызначэння кошту платных паслуг.
26. Фінансава-коштавыя паказчыкі бібліятэчнай работы.
27. Методыка складання каштарысу мэтавай бібліятэчнай праграмы.
28. Паняцце і структура адзінага фонда фінансавых сродкаў бібліятэкі.
29. Спосабы размеркавання адзінага фонду фінансавых сродкаў бібліятэкі.
30. Методыка складання штатнага раскладу і разліка фонда працоўнага часу ў бібліятэцы.
31. Фарімраванне фонду зарабатнай платы.
32. Фонд вытворчага і сацыяльнага развіцця бібліятэкі.
33. Пазабюджэтныя крыніцы фінансавання бібліятэк і асаблівасці іх размеркавання.
34. Фонд матэрыяльнага заахвочвання ў бібліятэцы.
35. Рэалізацыйны і нерэалізацыйны падыходы да фінансавання бібліятэк.
36. Фінансава-цэнастныя паказчыкі бібліятэчнай работы.

## 5. ДАПАМОЖНЫ РАЗДЗЕЛ
### 5.1.Вучэбная праграма

**Складальнікі:**
*Н. Я. Петушка,* дацэнт кафедры менеджменту інфармацыйна-дакументнай сферы ўстановы адукацыі «Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў», кандыдат педагагічных навук, дацэнт
*В. М. Бігеза,* дацэнт кафедры менеджменту інфармацыйна-дакументнай сферы ўстановы адукацыі «Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў», кандыдат філалагічных навук, дацэнт

### *Уводзіны*

Прадмет, структура, задачы вучэбнай дысцыпліны «Эканоміка бібліятэчна-інфармацыйнай дзейнасці». Яе месца ў сістэме прафесійнай падрыхтоўкі бібліятэкараў-бібліёграфаў. Веды, уменні і навыкі, якія набываюць студэнты ў працэсе вывучэння вучэбнай дысцыпліны. Узаемасувязі вучэбнай дысцыпліны «Эканоміка бібліятэчна-інфармацыйнай дзейнасці» з іншымі спецыяльнымі вучэбнымі дысцыплінамі. Асноўныя формы аўдыторнай і пазааўдыторнай работы пры вывучэнні вучэбнай дысцыпліны. Асноўныя формы кантролю: бягучыя, прамежкавыя і выніковыя. Характарыстыка забяспечанасці вучэбнай дысцыпліны вучэбна-метадычнай літаратурай.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

## I. Агульныя пытанні эканомікі бібліятэчна-інфармацыйнай дзейнасці

### *Тэма 1. Эканамічныя адносіны ў сферы бібліятэчна-інфармацыйнай дзейнасці*

Бібліятэчная справа – падгаліна грамадскага сектара эканомікі. Эканоміка бібліятэчнай справы як састаўная частка эканомікі культуры. Эканамічныя функцыі і сувязі бібліятэчнай справы. Вызначэнне і суадносіны паняццяў “эканоміка бібліятэчный справы” і “эканоміка бібліятэчнай дзейнасці”. Прадмет, аб’ект і метады вывучэння эканомікі бібліятэчнай справы. Мэты бібліятэчнай эканамічнай навукі. Мікра- і макраўзроўні эканамічных адносінаў у бібліятэчна-інфармацыйнай сферы, іх спецыфіка: адносіны з нагоды уласнасці, грамадскага падзелу працы, адукацыі і выкарыстання рэсурсных фондаў, узнаўлення і пр. Інфармацыйныя рэсурсы і патрэбы, метаінфармацыйны прадукт, інфармацыйна-аналітычная дзейнасць – аб’екты таварна-грашовых адносінаў у бібліятэчнай справе.

Эканоміка бібліятэчнай справы як галіна навуковых даследаванняў і прыкладных распрацовак, іх напрамкі.

### *Тэма 2. Тэарэтыка-прыкладныя аспекты бібліятэчнай мікраэканомікі*

Прымяненне агульнай макраэканамічнай тэорыі ва ўмовах бібліятэкі як малой эканамічнай адзінкі. Вызначэнне паняцця “бібліятэчная мікраэканоміка”. Погляды айчынных і замежных спецыялістаў на мікраэканамічныя працэсы бібліятэчнай дзейнасці. Задачы бібліятэчнай мікраэканомікі. Напрамкі мікраэканамічных даследаванняў у бібліятэчнай справе. Кампаненты бібліятэчнай мікраэканомікі: тэорыя попыту, канцэпцыя карыснасці, эфект нявызначанасці выбару карыстальніка, ідэя канкурэнтных рынкаў, палітыка цанавой дыверсіфікацыі на платныя формы абслугоўвання, тэорыя эканамічнай эфектыўнасці. Агульная характарыстыка пытанняў мікраэканамічнага асмыслення бібліятэчнай дзейнасці.

Мікраэканамічны падыход да кіравання бібліятэкай. Мадэлі мікраэканамічнай дзейнасці бібліятэкі. Характарыстыка этапаў распрацоўкі мадэляў.

Эканамічныя метады кіравання бібліятэкай. Паняцце “эканамічныя метады кіравання”. Выкарыстанне эканамічных метадаў кіравання ў комплексе метадаў даследавання і арганізацыі кіравання. Фінансаванне, як метад кіравання. Метад эканамічнага стымулявання: асноўная характарыстыка. Гаспадарчы разлік – асноўны эканамічны метад кіравання. Залежнасць эфектыўнасці эканамічных метадаў кіравання ад сістэмы

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

эканамічных нарматываў. Эканамічныя нарматывы як база рэалізацыі арганізацыйна-распарадчых метадаў кіравання. Агульная характарыстыка рэгламентавання, нарміравання і інструктавання як метадаў арганізацыйнага ўздзеяння на калектыў супрацоўнікаў. Характарыстыка метадаў распарадчага ўздзеяння і метадаў дысцыплінарнага ўздзеяння. Выкарыстанне сістэмы дадатковых грашовых выплат супрацоўнікам. Формы дадатковага матэрыяльнага стымулявання. Нематэрыяльныя формы эканамічнага стымулявання. Узаемазалежнасць эканамічных метадаў і сацыяльна-псіхалагічных метадаў кіравання. Характарыстыка асноўных груп сацыяльна-псіхалагічных метадаў кіравання. Развіццё эканамічных метадаў кіравання бібліятэкай ва ўмовах рынку. Фактары павышэння эфектыўнасці выкарыстання эканамічных метадаў кіравання бібліятэкай і дзейнасцю бібліятэчных калектываў.

### *Тэма 3. Эканамічныя паказчыкі бібліятэчнай работы*

Фінансава-коштавыя паказчыкі ў сістэме ацэнкі эфектыўнасці дзейнасці бібліятэк: функцыянальны (тэхнічны), сацыяльны і эканамічны падыходы. Наменклатура фінансава-коштавых паказчыкаў бібліятэчнай работы. Коштавыя паказчыкі пэўнага тэхналагічнага цыклу як аснова аналізу бібліятэчна-інфармацыйнай дзейнасці. Агульная характарыстыка комплексу паказчыкаў сацыяльнай накіраванасці.

Сутнасць, якасці і сістэма фінансава-коштавых паказчыкаў работы бібліятэк. Комплексныя (зводныя) фінансава-коштавыя паказчыкі: агульная сума выдаткаў бібліятэкі, размеркаванне сродкаў па артыкулах каштарысу, кошт абслугоўвання аднаго карыстальніка, выдаткі на адно наведванне бібліятэкі, ажыццяўленне кнігавыдачы - методыка разліку і выкарыстанне.

Асобныя (прыватныя) фінансава-коштавыя паказчыкі: кошт пэўнага бібліятэчнага працэсу ці аперацыі, сярэднія выдаткі на іх.

Зыходныя крыніцы вызначэння фінансава-коштавых паказчыкаў: гадавы каштарыс бібліятэкі, фінансавыя справаздачы, планавыя і фактычныя колькасныя паказчыкі работы бібліятэкі.

Выкарыстанне тэхналагічных карт пры вызначэнні і падліку фінансава-коштавых паказчыкаў. Асаблівасці выкарыстання поўнага ці бягучага кошту паслугі пры вылічэнні фінансава-коштавых паказчыкаў. Характарыстыка поўнай і бягучай ацэнкі кошту бібліятэчна-інфармацыйных прадуктаў і паслуг.

### *Тэма 4. Фінансавае забеспячэнне функцыянавання бібліятэкі*

Фінансавы механізм бібліятэчна-інфармацыйнай дзейнасці: крытэрыі вызначэння прыярытэтных кірункаў фінансавання, сацыяльнай і эканамічнай

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

эфектыўнасці; мадэлі рэсурснага забеспячэння; дзяржаўна-прыватнае інавацыйнае развіццѐ і сеткавае ўзаемадзеянне. Вызначэнне паняццяў “фінансаванне бібліятэк”, “фінансавыя рэсурсы”. Напрамкі размеркавання і пераразмеркавання фінансавых рэсурсаў у межах бібліятэчнай галіны, бібліятэчных сістэм і асобных бібліятэк. Суадносіны рэнтнага прыбытку і бюджэтнага фінансавання. Функцыі і напрамкі дзейнасці планава-эканамічных і адміністрацыйна-гаспадарчых аддзелаў (упраўленняў) бібліятэк.

Дзяржаўныя мінімальныя стандарты бібліятэчна-інфармацыйнай дзейнасці: агульная характарыстыка, сацыяльна-эканамічны змест, заканадаўчае замацаванне фінансавых абавязкаў. Фарміраванне сістэмы пазабюджэтнага фінансавання бібліятэчнай дзейнасці: сучасны стан, праблемы, перспектывы. Мэтавыя нарматывы фінансавання бібліятэчнай работы: сутнасць, умовы разліку і выкарыстання, інвестыцыйныя магчымасці.

Крыніцы і прынцыпы фінансавання бібліятэк. Паняцце “асноўныя крыніцы фінансавання бібліятэк”. Прыярытэты бюджэтнага фінансавання бібліятэк. Рэспубліканскі, рэгіянальны, ведамасны ўзроўні бюджэтных паступленняў. Асаблівасці фінансавання бібліятэк з рэспубліканскага і мясцовых бюджэтаў. Фінансавыя сродкі заснавальнікаў бібліятэк. Бюджэты дзяржаўных, камерцыйных і грамадскіх прадпрыемстваў і арганізацый, як крыніцы фінансавання бібліятэк. Асаблівасці фінансавання бібліятэк сродкамі фандрэйзінгу. Мэтавае фінансаванне сацыяльна значных бібліятэчных праграм і праектаў. Даходы ад прадпрымальніцкай дзейнасці ў структуры бюджэту бібліятэкі.

Астаткавы, затратны, сецявы, нарматыўны і праграмна-мэтавы прынцыпы фінансавання бібліятэк. Прымяненне гэтых прынцыпаў пры фінансаванні бібліятэк розных тыпаў і відаў на пэўных этапах развіцця грамадства. Самафінансаванне.

Адзіны фонд фінансавых сродкаў бібліятэкі. Вызначэнне паняцця “адзіны фонд фінансавых сродкаў”. Асаблівасці размеркавання адзінага фонду фінансавых сродкаў у бібліятэках. Фонд заработнай платы: фарміраванне і методыка размеркаваня (выдаткі на аплату працы штатных і пазаштатных супрацоўнікаў, выдаткі на адпачынак, кампенсацыі, надбаўкі). Уплыў групы па аплаце працы на фарміраванне фонду заработнай платы; улік Адзінай тарыфнай сеткі і кваліфікацыйных патрабаванняў да ўстанаўлення разрадаў аплаты бібліятэчнай працы. Мэты стварэння фонду матэрыяльнага заахвочвання і прынцыпы яго размеркавання. Складаючыя элементы фонду матэрыяльнага заахвочвання. Фонд творча-вытворчага і сацыяльнага развіцця, як крыніца сродкаў для ўмацавання матэрыяльна-тэхнічнай базы бібліятэкі. Механізм фарміравання і выкарыстання сродкаў творча-вытворчага і

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

сацыяльнага развіцця. Магчымасці стварэння ў бібліятэках фонду валютных паступленняў.

Фінансавая дакументацыя бібліятэк: каштарыс, бізнес-план паслугі, дамовы, кантракты, палажэнні, інструкцыі, фінансавыя планы, акты і рахункі набыцця і спісання маѐмасці.

## ІІ. Арганізацыйна-кіраўніцкае забеспячэнне эканомікі бібліятэчна-інфармацыйнай дзейнасці

### *Тэма 5. Ініцыятыўная гаспадарча-эканамічная дзейнасць бібліятэкі*

Вызначэнне паняцця “ініцыятыўная дзейнасць бібліятэкі”. Варыянты ініцыятыўных напрамкаў бібліятэчнай работы, іх сацыяльна-эканамічнае абгрунтаванне з улікам існуючай прававой прасторы, бібліятэчнай макраэканамічнай і знешняй рынкавага асяроддзя.

Вызначэнне паняцця “гаспадарчая дзейнасць бібліятэк”. Асноўныя аб’екты гаспадарчай дзейнасці бібліятэк: маѐмасць, фінансавыя сродкі, інтэлектуальныя прадукты і працоўныя рэсурсы. Змест гаспадарчай дзейнасці бібліятэк. Фінансавыя, працоўныя і камерцыйныя адносіны ў сістэме гаспадарчай дзейнасці бібліятэк. Узроўні рэгулявання фінансавых, працоўных і камерцыйных адносін у бібліятэках. Суадносіны гаспадарчай дзейнасці бібліятэк з грамадскім сектарам і камерцыйнай сферай.

Вызначэнне паняцця “гаспадарчы механізм”. Прынцыпы гаспадарчага механізму бібліятэк. Задачы гаспадарчага механізму ў бібліятэчнай справе. Узроўні фарміравання гаспадарчага механізму ў бібліятэках розных тыпаў. Арганізацыя сістэмы заработнай платы і стымулявання працы, як элемент гаспадарчага механізму.

Вызначэнне паняцця “гаспадарчы разлік”. Сутнасць гаспадарчага разліку ў дзейнасці бібліятэчных устаноў. Прыбытковая і нарматыўная мадэлі гаспадарчага разліку ў дзейнасці бібліятэк: сутнасць, прынцыпы размеркавання грашовых сродкаў. Месца ўнутрыбібліятэчнага гаспадарчага разліку ў эканоміцы бібліятэчнай дзейнасці. Магчымасці выкарыстання прынцыпаў самаакупнасці, планавання, матэрыяльнага заахвочвання і адказнасці калектыву, грашовага кантролю за гаспадарчай дзейнасцю ў бібліятэчных установах.

Паказчыкі эфектыўнасці гаспадарчай дзейнасці бібліятэк: прыбытак, сабекошт бібліятэчнай прадукцыі.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

### *Тэма 6. Звышнарматыўныя паслугі і абслугоўванне ў сістэме сучаснай эканамічнай практыкі бібліятэкі*

Месца сучаснай бібліятэкі на рынку паслуг. Межы і суадносіны бясплатнага і платнага у дзейнасці канкрэтнай бібліятэкі. Звышнарматыўныя платныя паслугі як варыянт мэтазгоднай ініцыятыўнай дзейнасці бібліятэкі ў эканамічных ўмовах.

Асноўныя і платныя паслугі бібліятэк: суадносіны і асноўная характарыстыка. Вызначэнне паняцця “платныя паслугі бібліятэк”. Дырэктыўныя і вольныя (дамоўныя) цэны на бібліятэчна-інфармацыйныя прадукты і паслугі. Класіфікацыя платных бібліятэчных паслуг: бібліятэчна-інфармацыйныя, дакументныя, бібліяграфічныя, інфармацыйныя, дасугавыя, методыка-кансультацыйныя, паслугі бібліятэчнага сервісу, сапутнічаючыя паслугі. Калькуляцыя як аснова цэнаўтварэння. Асноўныя артыкулы калькуляцыі: прамыя выдаткі, накладныя выдаткі, сабекошт паслугі, прыбытак, каштарыс паслугі, праекціруемая цана паслугі, выкарыстанне нормаў часу, тэхналагічных карт і адзінак вымярэння. Методыка разліку кошту платнай бібліятэчнай паслугі.

Арганізацыйна-метадычныя асаблівасці распрацоўкі наменклатуры платных паслуг. Нарматыўная рэгламентацыя ўкаранення наменклатуры платных паслуг у бібліятэках розных тыпаў. Выкарыстанне спецыяльных картатэк і баз даных пры рабоце з наменклатурай платных паслуг. Залежнасць наменклатуры платных паслуг ад тыпу бібліятэкі, яе матэрыяльных магчымасцей, структуры, тэхналогій. Характарыстыка Палажэння аб платных паслугах бібліятэк Рэспублікі Беларусь. Палажэнні аб платных паслугах універсальных і галіновых бібліятэк Рэспублікі Беларусь: сапастаўіцельны аналіз.

### *Тэма 7. Гаспадарча-дагаворныя адносіны з удзелам бібліятэкі*

Паняцце “дагаворныя (дагаворна-прававыя) адносіны ва ўмовах бібліятэкі”. Прававая рэгламентацыя грамадзянска-прававых дагавораў.

Гаспадарчы дагавор. Тыповая структура гаспадарчага дагавору.

Віды дамоўных адносін (дагаворы куплі-продажу; дагаворы падраду; дагаворы аб сумеснай дзейнасці; асаблівыя віды дагавораў).

Арганізацыйна-тэхналагічныя асаблівасці складання дамовы куплі-продажу – паслуг і прадукцыі; канкрэтных праў; арэндныя.

Методыка складання дамовы падраду – на стварэнне і перадачу інтэлектуальнага прадукту (паслуг / прадукцыі); аб інфармацыйна-

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

кансалтынгавым і іншым абслугоўванні; на рэкламу паслуг / прадукцыі або віду дзейнасці.

Методыка складання дамовы аб сумеснай дзейнасці – аб стварэнні часовай арганізацыйна-прававой структуры без статусу юрыдычнай асобы; даручэння, камісіі і агенцкія; пазыкі і крэдытавання і інш..

Структура і тэхналогія стварэння асаблівых відаў дамоваў – пра дабрачыннае рэсурснае забеспячэнне (дарэння / ахвяраванні) і інш.

### *Тэма 8. Сацыяльна-эканамічныя нормы і нарматывы ў бібліятэчнай справе*

Бібліятэка як сацыяльна-эканамічная сістэма: характарыстыка асноўных падсістэм і элементаў. Вызначэнне паняццяў “нормы” і “нарматывы”. Нормы, як сродак рэгулявання дзейнасці бібліятэк. Віды нормаў (нормы абслугоўвання, сецявыя нормы, рэсурсныя нормы, нормы эфектыўнасці). Адзінкі вымярэння нормаў. Адзінкі выражэння нормаў. Характарыстыка асноўных груп нормаў: мінімальныя, аптымальныя, максімальныя, дыферэнцыраваныя. Метады вызначэння нормаў: эмпірычны, навуковага мадэлявання, метад запазычання. Роля дзяржаўных органаў улады ў вызначэнні нормаў. Значэнне нормаў для эканомікі бібліятэчнай справы.

Інструктыўна-нарматыўная дакументацыя як аснова нарміравання. Распрацоўка бібліятэкамі асабістых нормаў, як перадумова атрымання сродкаў з мясцовых бюджэтаў.

Нарміраванне тэхналагічных аперацый у бібліятэках: асноўныя падыходы. Узаемасувязь норм выпрацоўкі, нарматываў пабудовы бібліятэчнай сеткі і фінансавання.

Паняцце “бібліятэчная эканаметрыя”. Эканаметрычныя мадэлі і эканаметрычны аналіз: агульная характарыстыка і ўзаемасувязь. Эканаметрычныя мадэлі як сродак распрацоўкі нарматываў у бібліятэчнай справе.

### *Тэма 9. Крытэрыі і паказчыкі эфектыўнасці эканамічнай дзейнасці бібліятэк*

Эканамічная эфектыўнасць як базавае паняцце і катэгорыя эканамічнай навукі. Вызначэнне паняцця “эканамічная эфектыўнасць” з тэарэтычнага і практычнага пунктаў гледжання.

Эканамічны аналіз у сістэме распрацоўкі крытэрыяў эканамічнай эфектыўнасці дзейнасці бібліятэк. Вызначэнне паняцця “эканамічны аналіз дзейнасці бібліятэк”. Аб’екты і віды эканамічнага аналізу ў бібліятэках. Мэты і методыка эканамічнага аналізу ў бібліятэчна-інфармацыйнай сферы. Функцыі эканамічнага аналізу ў працэсе кіравання бібліятэкай. Інфармацыя і

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

ўмовы неабходныя для здзяйснення эканамічнага аналізу і выкарыстання эканамічных паказчыкаў. Роля эканамічнага аналізу ў практыцы кіравання бібліятэкай.

Выбар і абгрунтаванне паказчыкаў эканамічнай эфектыўнасці. Уліковыя эканамічныя паказчыкі: паказчыкі бухгалтарскага, статыстычнага і аператыўнага ўліку – агульная характарыстыка і методыка разліку. Выдаткі і сабекошт як асноўныя крытэрыі эканамічнай эфектыўнасці. Пазаўліковыя эканамічныя паказчыкі – паказчыкі ўдзельнай вагі пэўнага віду выдаткаў у агульным аб'ёме расходаў бібліятэкі.

Характарыстыка сістэмы эканамічных паказчыкаў выкарыстання матэрыяльна-тэхнічнай базы бібліятэк: фондааддача, фондаѐмістасць, фондаўзброенасць. Паняцце амартызацыі і маральнага старэння матэрыяльных рэсурсаў.

Паказчыкі ацэнкі выкарыстання працоўных рэсурсаў бібліятэк.

Паказчыкі ацэнкі прафесійна-кваліфікацыйнай структуры бібліятэчных супрацоўнікаў.

Паказчыкі забяспечанасці насельніцтва бібліятэчнымі рэсурсамі.

Сістэма паказчыкаў функцыянальнай (тэхналагічнай эфектыўнасці) бібліятэчнай дзейнасці.

Паняцце якасці працы бібліятэк – галоўны крытэрый эканамічнай эфектыўнасці дзейнасці бібліятэк.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

## 5.2. ВУЧЭБНА-МЕТАДЫЧНАЯ КАРТА ВУЧЭБНАЙ ДЫСЦЫПЛІНЫ

| Назва раздзела, тэмы | Колькасць аўдыторных гадзін | | | | Колькасць гадзін КСР | Форма кантролю ведаў |
|---|---|---|---|---|---|---|
| | лекцыі | Практычныя заняткі | семінарскія заняткі | лабараторныя заняткі | | |
| 1 | 2 | 3 | 4 | 5 | 6 | 7 |
| Уводзіны | 1 | | | | | |
| **I. Агульныя пытанні эканомікі бібліятэчна-інфармацыйнай дзейнасці** | | | | | | |
| *Тэма 1.* Эканамічныя адносіны ў сферы бібліятэчна-інфармацыйнай дзейнасці | 2 | | | | 1 | Тэставае апытанне. Выступленні на семінары. |
| *Тэма 2.* Тэарэтыка-прыкладныя аспекты бібліятэчнай мікраэканомікі | 2 | 2 | 2 | | 2 | Тэставае апытанне. Выступленні на семінары. |
| *Тэма 3.* Эканамічныя паказчыкі бібліятэчнай работы | 1 | | | | 1 | Даследчыя заданні. |
| *Тэма 4.* Фінансавае забеспячэнне функцыянавання бібліятэкі | 2 | 4 | | 2 | 1 | Выступленні на семінары. |
| **II. Арганізацыйна-кіраўніцкае забеспячэнне эканомікі бібліятэчна-інфармацыйнай дзейнасці** | | | | | | |
| *Тэма 5.* Ініцыятыўная гаспадарча-эканамічная дзейнасць бібліятэкі | 2 | 4 | 2 | | 1 | Аналіз ініцыятыўнай гаспадарча-эканамічнай дзейнасці бібліятэкі (на прыкладзе работы канкрэтнай бібліятэкі). |

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

| | | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|---|
| | | | | | | Падрыхтоўка прэзентацый. |
| *Тэма 6.* Звышнарматыўныя паслугі і абслугоўванне ў сістэме сучаснай эканамічнай практыкі бібліятэкі | 1 | | | 4 | 1 | Распрацаваць праект калькуляцыйнага ліста для ўстанаўлення кошту/цаны пэўнай бібліятэчнай паслугі. |
| *Тэма 7.* Гаспадарча-дагаворныя адносіны з удзелам бібліятэкі | 1 | | | | 1 | Ажыццявіць мадэляванне сістэмы дагавораў пэўнай бібліятэкі. |
| *Тэма 8.* Сацыяльна-эканамічныя нормы і нарматывы ў бібліятэчнай справе | 2 | | | | 1 | Выступленні на семінары. |
| *Тэма 9.* Крытэрыі і паказчыкі эфектыўнасці эканамічнай дзейнасці бібліятэк | 2 | | 2 | 2 | 1 | Правесці лакальны эканамічны аналіз і / або ацаніць сацыяльна-эканамічную эфектыўнасць функцыянавання структурнага падраздзялення канкрэтнай бібліятэкі |
| **Усяго…** | **16** | **10** | **6** | **8** | **10** | |

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

## Асноўная літаратура

1. *Кодэкс Рэспублікі Беларусь аб культуры* : уступае ў сілу 3 лютага 2017 года / [адк. за вып. Н. В. Судзілоўская]. – Мінск : Нац. цэнтр прававой інфарм. Рэсп. Беларусь, 2016. – 272 с.

2. *Об утверждении Государственной программы Культура Беларуси на 2021-2025 годы* [Электронный ресурс]: постановление Совета Министров Республики Беларусь : 29 января 2021 г. № 53 // Эталонный банк данных правовой информации Республики Беларусь / Национальный центр правовой информации Республики Беларусь. – Минск, 2021. – Режим доступа: https://pravo.by/document/?guid=3871&p0=C22100053. – Дата доступа: 21.08.2021.

3. *Басамыгина, И.Н.* Микроэкономика библиотечного дела: науч.-практ. пособие / И.Н.Басамыгина.– М.: Либерея – Бибинформ, 2006.– 160с.

4. *Галковская, Ю. Н.* Правовое обеспечение деятельности библиотек в Республике Беларусь: науч.-практ. пособие / Ю. Н. Галковская. – Минск : Новое знание, 2008. – С. 127–128, 132–134. – (Сер. «Профессионалам библиотечного дела»).

5. *Клюев, В.К.* Менеджмент ресурсного потенциала библиотеки: учеб.-метод. пособие / В. К. Клюев. – М.: Литера, 2011. – 112с.

6. *Кожевникова, Л.А.* Экономические ресурсы научных библиотек: монография / Л.А.Кожевникова.– М.: Либерея-Бибинформ, 2006.– 188с

7. *Меньщикова, С.П.* Современные критерии и показатели оценки качества библиотечной деятельности: практ. пособие / С. П. Меньщикова. – М. : Литера, 2009. – 93 с. – (Серия «Современная библиотека» ; вып. 48).

8. *Меренкова, Н.*А. Дополнительные источники ресурсного обеспечения: некоммерческие фонды поддержки библиотек: научно-метод. пособие / Н. А. Меренкова. – М.: Литера, 2009. – 175 с. – (Серия «Современная библиотека»; вып. 57).

9. *Петушко, Н. Е.* Библиотечный маркетинг: учеб.-метод. пособие / Н. Е. Петушко. – Минск: Бел. гос. ун-т культуры и искусств, 2010. – 116 с.

10. *Пераверзева, Ю. А.* Фінансава-эканамічная дзейнасць бібліятэк: вучэб.-метад. дапам. / Ю. А. Пераверзева. – Мінск: Бел. дзярж. ун-т культуры і мастацтваў, 2009. – С. 32–39, 85–92.

11. *Российское* библиотековедение: XX век. Направление, проблемы и итоги: опыт монографического исследования / Рос. гос. б-ка; сост. и предисл. Ю. П. Мелентьевой. – М.: Пашков дом, 2001. – С. 248–267, 377–388.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

**Дадатковая літаратура**

12. *Голубенко, Н. Б.* Библиотечное дело: инновации и перспективы / Н. Б. Голубенко. – М. : Логос, 2014. – 125 с.

13. *Гузнер, С. С.* Адаптация библиотек: подходы, методы, модели, практика : науч.-метод. пособие / С. С. Гузнер, Л. А. Кожевникова, О. В. Макеева. – М. : Либерея-Бибинформ, 2013. – 159 с. – (Серия «Библиотекарь и время. XXI век» ; вып. 145).

14. *Клюев, В. К.* Маркетинговая парадигма современных публичных библиотек / В. К. Клюев // Библиотечное дело. – 2015. – № 3. – С. 14–19.

15. *Клюев, В. К.* Экономический микроуровень библиотеки / В. К. Клюев // Вестник библиотек Москвы. – 2008. – № 3. – С. 5–8.

16. *Колегаева, С. Д.* Экономизация библиотечной сферы: терминологическое осмысление // Библиотечное дело – XXI век: науч.-практ. сб.: вып. 2 (16)’2008 / Рос. гос. б-ка. – М., 2008. – С.171–179. – (Прил. к журн. «Библиотековедение»).

17. *Метадычныя рэкамендацыі* па арганізацыі платных паслуг у бібліятэках / склад. А. Е. Даўгаполава; рэдкал. Г. А. Гамеза [і інш.] – Мінск: НББ, 2009. – 28 с.

18. *Пол, Р.* Измерение качества деятельности библиотек / Розвитта Пол, Питер те Бокхорст / Рос. гос. б-ка ; пер. с англ. [и науч. ред. Г.А.Кисловской]. – Стер. переизд. – М. : Пашков дом, 2010. – 316 с.

19. *Редькина, Н. С.* Технологический менеджмент в системе управления библиотекой : [моногр.] / Н. С. Редькина ; Гос. публ. науч.-техн. б-ка Сиб. отд-ния Рос. акад. наук. – Новосибирск : ГПНТБ СО РАН, 2014. – 414 с.

*20.* *Романов, П.С.* Концепции стоимости библиотечно-информационных услуг в зарубежном библиотековедении: анализ, тенденции, взаимосвязи / П.С. Романов // Библиотековедение. – 2009. – N 6. – С. 29-32.

21. *Сидорин, В. В.* Маркетинг – нечуждое понятие для современной библиотеки / В. В. Сидорин // Библиотечное дело. – 2015. – № 3. – С. 20–22.

22. *Соколов, А. В.* Библиотечная маркетология как библиотековедческая дисциплина / А.В. Соколов // Библиотечное дело. – 2015. – № 3. – С. 2–9.

23. *Справочник библиотекаря* / под ред. А.Н.Ванеева, В.А.Минкиной.– СПб.: Профессия, 2000.– С.283–305.

24. *Суслова, И. М.* Функциональные технологии информационно-библиотечного менеджмента : учеб. пособие / И. М. Суслова, Л. А. Абрамова. – Санкт-Петербург : Профессия, 2014. – 280 с. – (Библиотека).

25. *Управление* библиотекой: учеб.-практ. пособие / А. С. Аверьянов, А. Н. Ванеев, В. Г. Горев [и др.]. – СПб.: Профессия, 2002. – С. 50–141. – (Сер. «Библиотека»).

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ